збярэцца — жываты папарвяце; той так спявае, што за сэрца возьме; той — казачнік, той — балалаечнік, той — скакун. А колькі майстроў — касіць, капіць, стагі складваць; жаць, малаціць, веяць! Пячы хлеб, варыць патраўку, калоць свіней, рэзаць цялят! Праць, ткаць, бяліць палатно! Пілаваць дровы, плесці лапці!». Скажыце, дзе, у якім творы вы бачылі на такім невялічкім тэкставым адрэзку пералік заняткаў, прафесій людзей.

Падаецца, што такое незвычайнае падарожжа не толькі пасадзейнічае паспяховаму засваенню зместу твора, але і навучыць юнакоў, дзяўчат захоўваць духоўны скарб сваёй Радзімы, памнажаць прыгажосць бацькоўскай зямлі, каб у сэрцах падлеткаў ніколі не сцёрся прывабны куток Бацькаўшчыны, каб яны імкнуліся занатаваць тое, што яшчэ жыве, цепліцца ў людской памяці, каб, спасцігаючы малое, зразумелі вялікае, усвядомілі сябе нашчадкамі багатай культурнай спадчыны. Важна, каб моладзь адчула ўнутраную патрэбнасць цеснай еднасці з роднай зямлёй, з бацькоўскай хатай.



Анастасія Макоўчык
студэнтка гістарычнага факультэта
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна» (г. Брэст, Беларусь)

# Краязнаўчая дзейнасць як сродак захавання гістарычнай памяці

Да адной з істотных характарыстык сучаснага свету адносіцца глабалізацыя, закрануўшая розныя бакі сацыяльнага жыцця. У сацыякультурнай прасторы глабалізацыя азначае прытрымліванне пэўнай агульнай ідэі, паводле якой у сучасным свеце павінны дамінаваць адзіныя агульнасусветныя каштоўнасці. Гэта можа пагражаць стратай нацыянальнай ідэнтычнасці і ўласнай культуры. Таму на сённяшні дзень актуальным застаецца пытанне аб захаванні гістарычнай памяці народа, якая ўяўляе аснову культурнай пераемнасці пакаленняў. Адным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

са сродкаў захавання гістарычнай памяці і самабытнай культуры народа з'яўляецца развіццё краязнаўчай дзейнасці.

Традыцыі вывучэння краю былі закладзены ў XVIII ст., а краязнаўства з'явілася ў якасці шырокага грамадскага руху ў канцы XIX ст., калі прадстаўнікі інтэлігенцыі і чыноўніцтва сталі паўсюдна ствараць таварыствы па вывучэнню губерняў, дзе яны жылі і працавалі [1, *308*]. Канчаткова тэрмін «краязнаўства» зацвердзіўся ў навуцы толькі ў пачатку 20-х гг. XX ст. [1, *307*].

Змястоўны аспект дадзенага тэрміна мяняўся на працягу ўсяго XX ст., што было звязана з палітычнымі, культурнымі і эканамічнымі зменамі ў краіне. Так, у 1960-я гг. краязнаўства вызначалі як комплекс навуковых дысцыплін, розных па зместу і прыватным метадам даследавання, вядучых у сваёй сукупнасці да ўсебаковага навуковага пазнання краю [7]. У цяперашні час краязнаўства вызначаюць як вывучэнне асобных мясцовасцей краіны з пункту гледжання іх геаграфічных, культурнагістарычных, эканамічных, этнаграфічных асаблівасцей [6, *296*].

У дадзеным артыкуле пад краязнаўствам маецца на ўвазе, у першую чаргу, гістарычнае краязнаўства, якое ставіць перад сабой задачу вывучэння на лакальным узроўні культуры, побыту і гісторыі таго ці іншага рэгіёна краіны. Гістарычнае краязнаўства з'яўляецца часткай гістарычнай навукі і выконвае важнейшыя функцыі: вывучае агульныя заканамернасці развіцця грамадства, улічваючы пры гэтым разнастайнасць лакальных гістарычных умоў, усе асаблівасці, што ўносяцца канкрэтнай творчасцю народа. Гістарычнае краязнаўства ўяўляе выключны ўніверсальны сацыякультурны механізм, які злучае і акцэнтуе тыя бакі гістарычнага існавання, што валодаюць найбольшай устойлівасцю. Краязнаўчая дзейнасць дазваляе вывучаць духоўнамаральныя традыцыі народа, транслюе яго культурную спадчыну і вопыт. Яна дапамагае чалавеку заняць месца ў гісторыі, стаўшы асновай працэсу захавання гістарычнай памяці.



Вывучэнне паняцця «гістарычная памяць» адносяць да 20-х гг. XX ст. і звязваюць з іменем французскага сацыёлага М. Хальбвакса. Ён першым абгрунтаваў тэзіс аб існаванні феномену калектыўнай памяці ў якасці сродку самаідэнтыфікацыі супольнасцей людзей. На думку М. Хальбвакса, кожная нацыя мае сваю гістарычную памяць, якая вызначае ідэнтычнасць дадзенага народа, але пры гэтым вельмі далёкую ад навуковых уяўленняў пра мінулае. У сваёй працы М. Хальбвакс вызначае памяць не як суму ўспамінаў асобных людзей, а як калектыўны культурны здабытак, які развіваецца пад уплывам сям'і, рэлігіі і сацыяльнай групы праз моўныя структуры, паўсядзённыя жыццёвыя практыкі і грамадскія ўстановы [8].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У агульным выглядзе гістарычную памяць можна ахарактарызаваць як устойлівую сістэму ўяўленняў пра мінулае, што існуюць у грамадскай свядомасці. Для яе ўласціва не столькі рацыянальная, колькі эмацыянальная ацэнка мінулага. Неабходна адзначыць, што гістарычная памяць выбарачная: яна карыстаецца іерархіяй фактаў, вылучаючы адны і аддаючы забыццю іншыя. А таксама падразумявае свядомы зварот да мінулага, з усімі яго плюсамі і мінусамі, негатыўным і пазітыўным зместам.

Вызначальным фактарам у захаванні гістарычнай памяці народа выступае выкарыстанне вусна-гістарычнага падыходу ў краязнаўстве. Ён заснаваны на ўвядзенні ў навуковы зварот крыніц новага тыпу, якія грунтуюцца на памяці жывых сведак свайго часу, вусна-гістарычных крыніц, створаных праз інтэрв'юіраванне, апытанне жыхароў пэўнай мясцовасці. Звужаюцца тэрытарыяльныя рамкі даследаванняў, што дазваляе выявіць спецыфіку гістарычнага развіцця канкрэтнага рэгіёна. Разам з тым, звесткі, атрыманыя метадам апытання, могуць стаць адпраўным пунктам для вывучэння новых, раней невядомых падзей з гісторыі мясцовасці. Часта ў вусна-гістарычных крыніцах уяўляюць цікавасць не самі гістарычныя падзеі, а ўяўленні і памяць звычайных людзей пра іх.



Выкарыстанне метадаў вуснай гісторыі, на думку П. Томпсана, дае магчымасць пабудаваць гістарычныя веды па прынцыпу «гісторыя знізу ўверх». Важным становіцца тое, як пераламляецца ацэнка падзей асобнымі людзьмі [5, *13*].

Вусна-гістарычны падыход у даследаваннях краязнаўцаў спрыяе з'яўленню новых тэм, што ўзнікаюць дзякуючы выкарыстанню індывідуальнага інтэрв'ю. Метад інтэрв'ю падразумявае гутарку з рэспандэнтам аб яго лёсе і жыццёвым вопыце ў пэўны гістарычны перыяд, індывідуальную ацэнку тых ці іншых гістарычных падзей і працэсаў. У ходзе інтэрв'ю даследчык разглядае пытанні, якія тычацца гісторыі населенага пункта, высвятляецца паходжанне яго назвы, назвы рэк і азёр, фіксуюцца легенды, звязаныя з імі. Чым больш рэспандэнтаў было апытана, тым разнастайней і рэалістычней будзе сабраны матэрыял. Метад інтэрв'ю таксама дапамагае зафіксаваць з дапамогай аўдыязапісу дыялект мясцовага насельніцтва. Інтэрв'ю да таго ж з'яўляецца метадам выяўлення розных крыніц, як пісьмовых, так і іншых (напрыклад, фотаздымкаў), якія немагчыма выявіць іншым шляхам, таму што яны знаходзяцца ва ўласнасці асобных людзей.

Для найбольш паспяховага інтэрв'ю трэба выбіраць рэспандэнтаў, што добраахвотна жадаюць супрацоўнічаць з інтэрв'юерам. Знешне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэс падобны на гутарку двух людзей, захопленых размовай. Такая нязмушаная абстаноўка спрыяе наладжванню камунікацыйных сувязей паміж карэспандэнтам і рэспандэнтам. Далей, адштурхнуўшыся ад агульнага пытання («раскажыце пра сябе, аб сваім дзяцінстве, аб тым, як вы перанеслі вайну, як склаўся ваш далейшы лёс»), у гутарцы свабодна развіваюцца тыя ці іншыя сюжэты. Пры непасрэдным апытанні лепш пазбягаць самога слова «інтэрв'ю», бо ў большасці рэспандэнтаў яно выклікае неадназначную рэакцыю, у тым ліку пачуццё напружанасці.

У час нашых краязнаўчых даследаванняў рэспандэнты ў вольнай форме дзяліліся сваімі ўспамінамі. Такая ўстаноўка аптымальна падыходзіла для свабоднага выкладу іх лёсу. Людзі атрымлівалі магчымасць казаць пра ўсё, што хацелі, маглі вольна будаваць сэнсавую мазаіку свайго жыцця. У ходзе самога інтэрв'ю мэтазгодна падтрымліваць спантаннасць маўленчага патоку рэспандэнта. Эфектыўным з'яўляецца выкарыстанне метадычнага прыёма «паўза ці маўчанне», які заключаецца ў тым, што, калі рэспандэнт змаўкае, інтэрв'юер не спяшаецца задаваць пытанне, а затрымлівае сваю рэакцыю. Асабісты вопыт сведчыць пра тое, што выкарыстанне паўзы вядзе да спантаннага пашырэння адказаў. Уяўляецца магчымым выхад на такія тэмы, развіццё якіх не меркавалася пры далейшым апытанні.



У ходзе інтэрв'ю можна сутыкнуцца з такімі цяжкасцямі, як абрыў тэмы, храналагічнай блытанінай у апавяданні, што служыць ахоўнай рэакцыяй пры закранутых пытаннях, што тычацца яго асабістага жыцця. У такіх сітуацыях мы стараліся не выказваць сваю незадаволенасць ці абурэнне. Асноўная задача, якую неабходна было ў дадзены момант выканаць, — дапамагчы апавядальніку, накіраваць яго з дапамогай зададзеных пытанняў.

У час размовы неабходна задумвацца не толькі аб тым, што і як кажуць рэспандэнты, але і аб тым, пра што і чаму яны маўчаць. Пытаючыся аб жыцці ў перыяд савецкай улады, многія пачынаюць маўчаць або даюць кароткі адказ, напрыклад, *«...Кто как работал, так и жил. И сейчас тунеядцев много. Хотя было трудно. Ну, как-то жили, я не знаю»* [2].

Рэспандэнты ахвотна апавядаюць аб гісторыі свайго краю, мясцовых традыцыях, паходжанні назвы населенага пункта. *«...Да, деревня называется Войтешин. Здесь когда-то жил какой-то Войцех и вся земля была его. Деревни тогда еще здесь не было. Это мать моя рассказывала. Вот его называли Войцехом, а место стали называть Войтешин»* [3].

У ходзе інтэрв'ю раскрываецца багаты пласт народнай культуры. Пытанні, што закранаюць духоўную і матэрыяльную культуру народа,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заўсёды выклікаюць цікавасць з боку рэспандэнта, «ажыўляюць» яго. Гэта адбываеццца таму, што такія ўспаміны аб нечым добрым, светлым і вясёлым ў жыцці, аб маладосці: *«...Купалье мы всегда отмечали в нашем парке. Хлопцы на возах навезут хвороста разного и как запалят... Девушки уже с утра венки плели, а ночью их в озеро опускали. Вот, Купалье было! Поют песни, танцуют, а кто-то горелку пьет. Те, что моложе были, все в парах ходили — кветку искали. На Купалье всегда весело было»* [4].

Акрамя згаданай інфармацыі з дапамогай апытанняў звычайных людзей адкрываюцца духоўны свет чалавека, яго каштоўнасці, традыцыі, стэрэатыпы, страхі і надзеі. Гэта найкаштоўнейшыя крыніцы як па краязнаўству, так і па культуры грамадства, значэнне якіх немагчыма пераацаніць.

Нягледзячы на разнастайныя сацыяльна-эканамічныя ўзрушэнні, краязнаўчая дзейнасць працягвае ажыццяўляцца і ў сучасных умовах. Важнай асаблівасцю краязнаўства з'яўляецца тое, што гэта: стваральная дзейнасць, накіраваная на захаванне прыродных і культурна-гістарычных багаццяў краю, і папулярызатарская дзейнасць, якая адкрывае зусім новае, каштоўнае для шырокай публікі. Краязнаўчая дзейнасць дазваляе назапашваць, захоўваць і перадаваць ад пакалення да пакалення велізарны аб'ём спецыяльных ведаў. Вывучэнне краязнаўчай спадчыны неабходна для разумення рэгіянальных асаблівасцей гістарычнага развіцця асобных абласцей краіны.



Сучасны этап у развіцці краязнаўства характарызуецца пашырэннем і паглыбленнем тэматыкі даследаванняў, а таксама выкарыстаннем вусна-гістарычнага падыходу, які дазваляе шматгранна аднаўляць падзеі мінулага. Выкарыстанне метадаў вуснай гісторыі краязнаўцамі ўяўляецца неабходным. Менавіта краязнаўца, даследуючы пэўную мясцовасць, здольны намаляваць поўную карціну аб ёй праз прызму чалавека, які жыве і стварае свой культурны асяродак. Такім чынам, краязнаўства выступае і як сродак навуковага пазнання гісторыі, і як інструмент захавання гістарычнай памяці народа.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. *Голов, А. Г.* Понятие «краеведение» в научной литературе пред- и послереволюционной России : отечественное краеведение 1920—1930-х гг. как объект исследования / А. Г. Голов // Вестник ТГУ. — Тамбов : Изд-во Тамбов. гос. ун-та, 2008. — Вып. 12 (68). — 624 с.

2. Личный архив автора. Интервью № 001 с А. А. Кожухом. — Брестская обл., Березовский р-н, д. Пески, 2015 г., окт.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Личный архив автора. Интервью № 002 с Н. А. Тимофейчик. — Брестская обл., Березовский р-н, д. Войтешин, 2015 г., нояб.

4. Личный архив автора. Интервью № 003 с О. А. Кожух. — Брестская обл., Березовский р-н, д. Пески, 2015 г., нояб.

5. *Лоскутова*, *М. В.* Хрестоматия по устной истории / М. В. Лоскутова ; пер., сост., введение, общ. ред. М. В. Лоскутовой. — СПб. : Изд-во Европ. ун-та в С.-Петербурге, 2003. — 396 с.

6. *Ожегов*, *С. И.* Толковый словарь русского языка / С. И. Ожегов, Н. Ю. Шведова. — М. : А ТЕМП, 2008. — 944 с.

7. *Строев*, *К. Ф.* Краеведение [Электронный ресурс] / К. Ф. Строев. — Режим доступа : http://school-kraevedenie.narod.ru/stroev/stroev1.htm. — Дата доступа : 01.12.2015.

8. *Хальбвакс*, *М.* Социальные рамки памяти / М. Хальбвакс. — М. : Новое издательство, 2007. — 348 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Андрэй Струнчанка

вядучы метадыст ДУ «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці», магістрант кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава» (г. Віцебск, Беларусь)



# Сядзіба «Мілае» дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Віцебшчыны XIX ст. Ігната Манькоўскага: гісторыя і сучаснасць

У басейне Заходняй Дзвіны,
Дзе Лужаснянка цячэ,
Курганы, бы карані,
Мая вёска спрадвеку жыве.
Тут прастора палёў і лясоў,
Хараство незямное навокал…
Мазалава… Тут радзіма мая
І жывая крынічка вытокаў!

*А. Струнчанка*

У аграгарадку Мазалава Віцебскага раёна Віцебскай вобласці захавалася сядзіба «Мілае» (помнік архітэктуры XIX ст.) колішняга дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Віцебшчыны Ігната Антонавіча Манькоўскага, які нарадзіўся на Віцебшчыне ў 1765 г. у сям'і дробнага шляхціца. Вядома, што пасля навучання ў езуіцкім калегіуме Ігнат Манькоўскі ў 1783 г. паступіў на дзяржаўную службу.